http://edoc.bseu.by/

*У.П. Масаловіч, аспірант,*
*БДУ, г. Мінск*
ulyana.masalovich@gmail.com

# РОЛЯ ІНТЭРНЭТ-КАМУНІКАЦЫЙ У ФАРМАВАННІ ПАТРЫЯТЫЗМУ

Інтэрнэт з'яўляецца неад'емнай часткай штодзённасці дастаткова вялікай колькасці людзей. Таму ёсць шэраг прычын, сярод якіх, безумоўна, развіццё навукі, тэхнікі, эвалюцыя формаў камунікацыі, актыўнае ўкараненне тэхналогій у розныя сферы чалавечага жыцця.

Варта адзначыць, што магчымасці, якія дае Інтэрнэт у глабалізаваным свеце закранаюць галіны адукацыі, медыцыны, культуры, навукі, вытворчасці. Складана адназначна вызначыць, якая сфера чалавечай дзейнасці існуе ці можа існаваць без выкарыстання Інтэрнэту на тым ці іншым узроўні.

Высокі ўзровень ўцягнутасці сучаснага чалавека ў сферы сеткавых узаемадзеянняў адкрывае новыя магчымасці для фарміравання, рэгулявання і трансфармацыі каштоўнасцяў, перакананняў і светапогляду. У рамках існуючага асяроддзя варта адзначыць змяненне і выраз такой з'явы як патрыятызм.

Неабходна вызначыць, што з сябе ўяўляе дадзены феномен: патрыятызм можна разглядаць як частку грамадскай свядомасці, сукупнасць каштоўнасцяў, установак, перакананняў, вераванняў, комплекс мер і стэрэатыпных паводзін, якія характарызуюць стаўленне чалавека да месца яго нараджэння, жыхарства. Асноўныя прынцыпы патрыятызму могуць быць адлюстраваны ў афіцыйных дакументах і рыторыцы дзяржавы, напрыклад, у ідэалогіі, ці ж існаваць у грамадзянскай супольнасці, выяўляючы сябе ў штодзённасці, мастацтве, навуцы, рэлігіі і іншых спосабах выразу. Здаровы патрыятызм павінен сумяшчаць у сабе адэкватную трактоўку і трансляцыю каштоўнасцяў, як з боку дзяржавы, так і з боку народных ініцыятыў.

Пры разглядзе пытання патрыятызму ў рамках Інтэрнэту варта вылучыць дзеючых актараў адпаведных працэсаў. Абавязкова павінна быць «крыніца» каштоўнасцяў, якая валодае высокім узроўнем даверу, кампетэнцыі, улады і ўплыву на іншых суб'ектаў працэсу, гэта можа быць сацыяльны інстытут (дзяржава), ўладная асоба (прэзідэнт), сацыяльная група; «атрымальнікам» жа дадзеных каштоўнасцяў становіцца народ, а пры дэталёвым разглядзе і асобны чалавек. Відавочна, што прамых кантактаў, у большасці выпадкаў, асобны чалавек не можа дасягнуць з «крыніцай», аднак Інтэрнэт дае унікальную магчымасць не толькі трансляваць інфармацыю на шырокі круг асоб, але і атрымліваць зваротную сувязь ад «атрымальнікаў». Бо калі разглядаць патрыятызм як элемент камунікацыі, то існаванне магчымасці ўзаемадзейнічаць, накіроўваць і карэктаваць напрамак думак «атрымальнікаў» з'яўляецца крытычна важным. Магчымасць рэгулявання і ўдзелу ў працэсе фарміравання і развіцця каштоўнасцяў з дапамогай найноўшых інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій – адна з найважнейшых задач «крыніцы».

Узнікаючыя выклікі і высокі ўзрост патрэбнасцяў грамадства правакуюць стварэнне і рэструктурызацыю формаў камунікацыі, зжыванне раней існуючых спосабаў ўзаемадзеяння, іх трансфармацыю. Акрамя ўзнікнення новых формаў камунікатыўных тэхналогій і практык, утвараюцца і новыя патрабаванні, што прад'яўляюцца да актараў камунікацыі. Гэта прадугледжвае, што суб'екты, якія ўдзельнічаюць у працэсе камунікацыі, акрамя «разумення сябе», «разумення іншага», «разумення сітуацыі камунікацыі» павінны прысвойваць сабе новыя веды, перакананні аб свеце, каштоўнасцях і узаемазвязанасці з'яў сацыяльнай рэальнасці [1].

Паводзіны і лад жыцця чалавека трансфармуюцца пад уплывам Інтэрнэту, яго звычкі, каштоўнасці, сэнсавыя арыенціры перажываюць шэраг змяненняў. Частка з іх

праходзіць натыўна і абсалютна натуральна, як эвалюцыйны працэс, некаторыя патрабуюць ад чалавека актыўнага дзеяння або жа, наадварот, бяздзеяння.

Варта адзначыць, што акрамя магчымасцяў, якія прадстаўляюцца Інтэрнэтам, існуюць і пэўныя ліміты: так, у колькасным вымярэнні карыстальнік атрымлівае неабмежаваную колькасць варыянтаў для разгляду, а калі казаць аб якасці прадстаўленай інфармацыі, то ўзнікае шэраг праблем, для вырашэння якіх неабходны развітыя навыкі і кампетэнцыі «медыяадукаванасці», «крытычнага чытання», «крытычнага ўспрымання».

Некаторыя навыкі могуць быць уласцівы індывідам па меры іх сацыялізацыі і развівацца без мэтанакіраванай зацікаўленасці суб'екта. Камунікатыўныя кампетэнцыі, якія патрабуюць асваення пэўных ведаў, разумення дзеючых механізмаў, фарміравання паняційна-крытычнай базы або «імунітэту» асвойваюцца індывідамі ў спецыфічных умовах (пр.: неабходнасць пастаяннай працы з вялікім аб'ёмам інфармацыі) [2]. У дадзеным выпадку «імунітэт» мае на ўвазе ўменне аналізаваць і фільтраваць інфармацыю, якая паступае, распазнаваць сапраўдную і псеўдапатрыятычную інфармацыю.

У некаторых выпадках, асабліва калі гаворка ідзе пра моладзь або часткі насельніцтва, у большай ступені схільнай да ўплыву знешніх фактараў, важна ўкараняць і развіваць дзеянні актараў-асветнікаў, якія навучаюць крытычна ўспрымаць інфармацыю. Важна вызначыць, што патрыятызм ўяўляе сабой развіццё, умацаванне, падтрымку нацыянальнай культуры і каштоўнасцяў, а не падмену паняццяў, адхіленне, разбурэнне. Як адзін са спосабаў дзеяння падобных фактараў можна прапанаваць вядзенне камунікацыі на роднай мове, а менавіта на беларускай. Беларуская мова ў такім аспекце будзе з'яўляцца рэпрэзентацыяй нацыянальнай культуры і настрояў, гістарычнай памяці і высокага ўзроўню прыхільнасці да роднай культуры.

Магчымыя камунікатыўныя практыкі для папулярызацыі беларускай мовы ў кантэксце патрыятычнага кірунку: вядзенне сацыяльных сетак на мове, камунікацыя з удзельнікамі анлайн-супольнасцяў на мове, стварэнне і распаўсюджванне тэматычнага кантэнту на мове, укараненне гульнявых элементаў камунікацыі на мове. Прымяненне падобных практык здольна павысіць узровень ўцягнутасці карыстальнікаў у патрыятычны кірунак з пазіцыі мовы, яе вывучэння, ужывання і распаўсюджвання. Немагчыма казаць пра патрыятызм без выкарыстання роднай мовы, а калі гаворка ідзе аб беларускай нацыі, то беларускі патрыятызм без беларускай мовы існаваць не можа.

Такім чынам, Інтэрнэт у сучасным свеце з'яўляецца важнай і неад'емнай часткай існавання пераважнай часткі соцыума. Інтэрнэт можа выступаць як інструмент для пабудовы камунікацыі, для пошуку інфармацыі, выконваць інтэгратыўную функцыю, рэкрэатыўную, якая дазваляе чалавеку пагружацца ў віртуальную, пакідаючы існуючую, рэальнасць, і ў той жа час з'яўляецца важным элементам развіцця патрыятызму.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Саенко, Л.А. Интернет-пространство как фактор формирования сетевого сообщества / Л.А. Саенко, М.В. Егоров // Историческая и социально-образовательная мысль. – 2015. – Т. 7, № 1. – С. 159-162.

2. Bernal, V. Nation as Network: Diaspora, Cyberspace, and Citizenship / V. Bernal. – Chicago: University of Chicago Press, 2014 – 208 p.